# Памятная сустрэча

Гэтымі днямі піонеры 3-х і 4-х класаў Малецкай сярэдняй школы сустрэліся з удзельнікам рэвалюцыйнага падполля ў час панскай Польшчы і ўдзельнікам ленінградскай блакады комуністам тав. Ручай Н.

Тав. Ручай расказаў рэбятам, як у 1934 годзе ў вёсцы Осаўцы (зараз Бярозаўскі раён) сабралася каля 2 тысяч падпольшчыкаў на мітынг. Для канспірацыі арганізавалі танцы, гулянне. Вёска была абстаўлена патрулямі з комсамольцаў. Нечакана наляцела паліцыя. Многіх арыштавалі і падверглі бесчалавечнаму допыту. Але паліцыі нічога даведацца так і не ўдалося.

—Цяжка жылося працоўнаму люду ў панскай Польшчы, — гаворыць тав. Ручай.—Многа здзекаў перанеслі вашы бацькі і маці, старэйшыя браты і сёстры.

Настаў 1939 год. Чырвоная Армія прагнала польскіх паноў з зямель Заходняй Беларусі. Устанавілася Савецкая ўлада. Беларускі народ атрымаў правы, аб якіх марылі і за якія змагаліся вашы дзяды і прадзеды.

Але нядоўга нам давялося будаваць шчаслівае жыццё. У 1941 годзе гітлераўская Германія без аб'явы вайны напала на Совецкі Саюз.

Затым тав. Ручай проста і даходліва расказвае піонерам аб цяжкіх і суровых днях ленінградскай блакады. Рэбяты з заміраннем сэрца лавілі кожнае слова.

—Цяжка, рэбяты, давялося нам адстойваць свабоду нашай цудоўнай Радзімы. Многа аддадзена жыцця, многа пакладзена працы, многа сіл аддадзена барацьбе, каб вы цяпер маглі свабодна сядзець за школьнымі партамі і вучыцца, вучыцца і вучыцца, — так закончыў свой расказ тав. Ручай.

Піонеры цёпла падзякавалі дарагому госцю і паднеслі яму букет кветак. Потым яны расказалі аб сваіх справах і падзяліліся планамі на будучае.

**А. Сцепановіч,**
старшы піонерважаты.